вития изобразительной культуры как одного из социокультурных средств кооперации и транслирования, метатипов описания объектов и метапрактики изложения событий разного типа, уровня и масштаба, социального ожидания и востребованности. Полагаем, что именно такой замысел способствует культурно ориентированному познанию и художественному осмысленному, гармоничному отношению к действительности, где изобразительные смысловые дискурсы способны обеспечить основные направления взаимодействий, будут своевременны для описания картины единого мира на интегративном комплексе понятий и метаизобразительном языке [4]. Считаем, что от культурно-осмысленного видения и отражения, трансдисциплинарного разрешения насущных социокультурных задач в настоящем, от выбора приоритетных направлений их решения из прошлого и настоящего (при осознании их аксиологических ориентиров) зависит творчески активное состояние культуры общества будущего.

*Литература:*


1. Жук, А. И. Образование – ведущий механизм достижения целей устойчивого развития : виртуальный круглый стол / А. И. Жук // Глобальные цели – благополучие каждого: Декада «Образование для устойчивого развития» : сборник материалов; под ред. А. И. Жука, А. В. Позняк, С. Б. Савеловой. – Минск : БГПУ, 2018. – С. 8–9.
2. Кашекова, И. Э. Интеграция культуры и образования в художественно-эстетическом образовательном пространстве / И. Э. Кашекова // Художественное образование в пространстве современной культуры : сб. науч. труд. по матер. межд. науч.-практ. конф., октябрь 2011 / Под общ. ред. И. Э. Кашековой. – Москва – Бойнице : ИХО РАО, 2011. – С. 23–33.
3. Кирнарская, Д. К. Актуальные проблемы развития художественного образования в XXI веке / Д. К. Кирнарская // Педагогика искусства : сетевой электронный научный журнал. – 2014. – № 3. – Режим доступа: http://www.art-education.ru/sites/default/files/journal_pdf/kirnarskaya_1-6_6.pdf.
4. Мокий, В. С. От дисциплинарности к трансдисциплинарности в понятиях и определениях / В. С. Мокий, Т. А. Лукьянова // Universum: Общественные науки : эл. науч. журнал. – 2016. – № 7 (25). – Режим доступа: http://7universum.com/ru/social/archive/item/3435.
5. Неменский, Б. М. Педагогика искусства. Видеть, ведать и творить / Б. М. Неменский. – М. : Просвещение, 2012. – 240 с.
6. Стоять и хранить предания. Художественное образование – взгляд профессионалов : выдержки из выст. участ. научн.-практ. конф. «Образование и творчество», октябрь 2004 г. // Художественная школа. – 2005. – № 1 (6). – С. 10–14.
7. Vermeulen, T. Notes on Metamodernism / T. Vermeulen, R. Van den Akker // Journal of Aesthetics and Culture. – 2010. – Vol. 2. – P. 1–14.


## АКВАРЭЛЬНАЙ ГАЛЕРЭІ БЫЦЬ!


***Рынкевіч Уладзімір Іванавіч,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail:kizo@vsu.by*


Надышоў час і, нарэшце, тое, што наспявала паўстагоддзя, здзейснілася. У красавіку 2019 года рашэннем Расонскага райвыканкама (старшыня У.У. Быкаў) была адкрыта першая ў Беларусі “Акварэльная галерэя”. Пры гэтым, не ў сталіцы, а ў невялікім раённым цэнтры на Віцебшчыне. Яе статус вызначаны як структурнае падраздзяленне Дзіцячай школы мастацтваў г.п. Расоны, дзе зараз часова і размешчана галерэя. Перспектывам яе могуць пазайздросціць многія існуючыя ўстановы культуры. Пад галерэю ўлады вырашылі аддаць цудоўны трохпавярховы будынак пачатку XX стагоддзя ў цэнтры населенага пункта над возерам, але гэта адбудзецца пасля рамонту будынка. Значнасць гэтай падзеі для Расонскага раёна і ўсёй рэспублікі, вызна-

Репозиторий ВГУ

чыць час. А вось рэальнасць надзеям надаюць аб’ектыўныя фактары, якія суправаджаюць і абумоўліваюць гэтую культурную акцыю.

Зварот увагі заснавальнікаў Расонскай акварэльнай галерэі да аднаго з найбольш папулярных і дэмакратычных відаў выяўленчай творчасці – акварэлі, сугучны агульнай плыні сучаснай сусветнай мастацкай практыкі. Першы музей акварэлі, як прыватная ўстанова, быў створаны ў 1960 годзе ў Мехіка. Ен быў заснаваны мастаком Альфрэдам Роха (1918– 2003). Пасля пажару адноўлены ў 1967 годзе і зараз існуе як Нацыянальны музей акварэлі ім. Альфреда Гуаці Роха. Па яго ініцыятыве ў 2001 годзе быў заснаваны Дзень акварэлі, які штогод адзначаецца 23 лістапада. Гэтая дата ўвайшла ў каляндар культурных падзей многіх краін свету і набыла статус Міжнароднага дня акварэлі.

На сутыкненні ХХ і ХХІ стагоддзяў акварэльныя галерэі і музеі пачалі расці як грыбы пасля дажджу ў Еўропе, Амерыцы, Азіі. Аб пашырэнні папулярнасці акварэлі сведчыць прагрэсіўная дынаміка правядзення міжнародных акварэльных фестываляў, выставак, конкурсаў. Вялікую актыўнасць праявілі аб’яднанні акварэлістаў у блізкім і далёкім замежжы: Міжнародная акварэльная суполка (International watercolor society – IWS), Суполка акварэлістаў Хьюстана (Watercolor Art Society – Houston), Суполка празрыстай акварэлі Амерыкі. (“Transparent Watercolor Society of America”), Брытанская Каралеўская суполка акварэлі (Royal Watercolour Society), Суполка акварэлістаў Францыі (Société Française de l'Aquarelle), Суполка акварэлі Італіі (Associazione Italiana Acquerellisti), Санкт-Пецярбургская суполка акварэлістаў (“Санкт-Петербургское общество акварелистов”) і многія іншыя. На працягу апошніх гадоў форумы акварэлістаў сусветнага маштабу адбыліся ў Італіі, Амерыцы, Каналы, Турцыі, Японіі, Кітая і інш. У іх прынялі ўдзел таксама і нашы суайчыннікі як прафесійныя мастакі, члены творчага Беларускага саюза мастакоў Вера Каўзановіч, Ганна Чапурная-Алейнік, Любоў Абрамава, так і акварэлісты-аматары: Кацярына Зюзіна (Сава), Вольга Навіцкая, Галіна Хайдарава,Ірына Данскова,Таццяна Лешчанка, Святлана Тупахіна і інш. Больш таго, іх акварэлі атрымалі ганаровыя дыпломы і занялі пачэснае месца ў зборах замежных калекцыянераў і мастацкіх галерэй. Ёсць аналагі акварэльных галерэй і ў нашых бліжэйшых суседзяў: у Польшчы, краінах Прыбалтыкі, Расіі, заўважым, не толькі ў сталічных цэнтрах, але і ў аддаленых гарадах, напрыклад, далёкім г. Кургане (абласны федэратыўны цэнтр Зауралля, Расія).

“Няма ў гэтым свеце выпадковасці, ёсць не пазнаная неабходнасць”,– кажуць філосафы. Стварэнне на Віцебшчыне Акварэльнай галерэі таксама не раптоўная падзея. Яна мае сваю гістарычную абумоўленасць. Расонскі раён разам з Полацкім, Верхнядзвінскім, Міёрскім, Шаркаўшчынскім і іншымі раёнамі належыць да Віцебскага культурна-тэрытарыяльнага рэгіёну. Старажытны Віцебск некалі губернскі, а сёння абласны цэнтр шырока вядомы ў гісторыі еўрапейскай, да і сусветнай культуры яркімі рэвалюцыйнымі падзеямі ў мастацтве і знакамітымі на ўвесь свет імёнамі: Марк Шагал, Казімір Малевіч. У савецкі час Віцебскі мастацкі тэхнікум даў пуцёўку ў жыццё цэламу пакаленню беларускіх творцаў, у тым ліку майстрам акварэлі (Л. Лейтман, М. Тарасікаў, А. Волкаў, Н. Галоўчанка). Пазней, у 1960–1970-я гады, мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута стаў мастацка-адукацыйнай пляцоўкай для акварэлістаў творчай студэнцкай моладзі на чале з Феліксам Гуменым. З часам захопленасць перарасла ў лакальную школу акварэлі. Гэты фактар паўплываў на тое, што прыблізна палова акварэлістаў Беларускага саюза мастакоў склалі выхаванцы віцебскай школы. Пасля развалу СССР і зноў праявіўся няўрымслівы характар кагорты віцебскіх мастакоў, якія аб’ядналіся ў творчую суполку “Віцебская акварэль”. Такім чынам стварэнне акварэльнай галерэі ў ціхамірным гарадку сярод лясоў ды азёр Прыдзвіння – справа для кагосьці нечаканая, а разабраўшыся – цалкам лагічная.



Репозиторий ВГУ

Стварэнне Акварэльнай галерэі з’явілася актуальным і своечасовым праектам у свеце дэклараванага ўладамі Беларусі культурнай палітыкі нашай дзяржавы з акцэнтам на развіццё рэгіёнаў. Асноўным урадавым дакументам у гэтай справе з’яўляецца «Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2016–2020 гады, зацверджаная Саветам міністраў Рэспублікі Беларусь, а таксама аб’вяшчэнне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, што 2018–2020 гады праходзяць ў Беларусі пад знакам “Года малой радзімы”.

На сённяшні дзень у Расонскай акварэльная галерэі адкрыта першая выстаўка акварэльных твораў беларускіх мастакоў. Яна мае тры выставачных пакоі ў двухпавярховым будынку мастацкай школы. Тут могуць праходзіць адна, або адначасова дзве невялікія выставы (30–40 твораў). Непараўнальна большыя магчымасці ў выставачнай дзейнасці галерэя набудзе пасля рэстаўрацыі асноўнага трохпавярховага будынка. Маёнтак памешчыка Гласка ў Расонах быў узведзены ў 1900 годзе па праекту архітэктара Эдмунда Фрыка на беразе возера Расоно. Будынак у выглядзе гатычнага палаца вылучаецца маляўнічнасцю, шматпланавасцю архітэктурнай кампазіцыі і разнастайнасцю яе візуальных успрыняццяў. Для ставарэння сярэдневяковай вобразнасці шырока прыцягваюцца неагатычныя формы. Расонскі палац узяты на магутны бутавы падмурак; план будынка складанай канфігурацыі з выгінамі калідораў, патаемнымі лесвічкамі, разнастайнымі заламі і інтымнымі пакойчыкамі. Шматпланавасць кампазіцыі ўзмацняе поліфанічная разнастайная пластыка фасадаў. Манументальны будынак вызначаецца насычаным коляравым вырашэннем, у якім спалучаецца паліхромія бутавай муроўкі цоколя, чырвоны колер высакаякаснай цаглянай муроўкі фасадаў, бялізна атынкаваных элементаў дэкору. Відавочна, што мета дойліда была стварыць уражальны знешні эфект.

Сядзібны дом пабудаваны ў маляўнічым месцы. Перад сядзібай змяшчаецца сажалка. Уздоўж дарогі пасаджаны ліпы, на тэрыторыі памесця раней знаходзіўся сад з пладовых дрэў, а ў цяпліцах вырошчваліся кветкі. Побач з сядзібай размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы таксама з чырвонае цэглы. На працягу ХХ стагоддзя сядзібны дом быў сведкам шматлікіх гістарычных падзей.

Бліжэйшай перспектывай дзеяння акварэльнай галерэі мы бачым яе ўкараненне ў музейную сетку Віцебска і Віцебскай вобласці, дзе зараз ужо дзейнічае 27 музеяў. У бліжэйшыя гады станаўлення Акварэльная галерэя будзе дзейнічаць як выставачная пляцоўка. Далей Акварэльная галерэя мае перспектыву стаць фестывальнай пляцоўкай мастакоў-акварэлістаў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў накшталт Міжнароднага фестывалю народнай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік” у Паставах, Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі “Званы Сафіі” у Полацку і да т.п. Канчатковай мэтай бачыцца яе перарастанне ў Музей акварэлі і малюнка рэспубліканскага падпарадкавання. Таксама ў перспектыве Акварэльная галерэя павінна стаць прывабным культурным і гістарычным аб’ектам для жыхароў раёну і турыстаў, які ўвойдзе ў турыстычныя маршрут па поўначы Беларусі. Яна аб’яднае мастацка-творчую, асветніцкаю і дасугава-займальную дзейнасць. У яе памяшканнях і на блізкай да будынку тэрыторыі мяркуецца размесціць: салон-магазін, які будзе рэалізоўваць мастацкія творы, сувеніры, матэрыялы для творчасці; творчую майстэрню, студыю, для дарослых і падлеткаў, кафе; міні-кіназал, салон-бібліятэка; вонкавая рэклама, імправізаваная эстрада для «хатніх канцэртаў» таксама і іншыя ўстановы культурнага профілю. Важнай задачай перад кіраўніцтвам раёну з’яўляецца падрыхтоўка прафесійных кадраў па музейна-галерэйнай справе.

Адкрыццё Расонскай Акварэльнай галерэі гэта – важны знакавы крок да актывізацыі працэсу аднаўлення культурнага жыцця Расонскага раёну і разам з тым рэальны ўнёсак у падтрымку ўзмацнення плыні развіцця акварэльнага жывапісу ў маштабе усёй рэспублікі. Правядзенне мастацкіх выставак высокага прафесіянальнага ўзроўню садзейнічаюць стымуляцыі развіцця мастацкай творчасці ў аддаленым ад сталіцы раёне. Выданне ў свет мастацка-літаратурнага календара з рэпрадукцыямі

Рэпазіторый ВГУ

твораў з мастацкага фонду галерэі, манаграфіі-альбома “Беларуская акварэлія” зацверджае вядомы ў еўрапейскім мастацтве значэнне беларускай акварэлі і брэнд “Віцебская акварэль” – гонар сучаснага беларускага мастацтва. Расонская Акварэльная галерэя сумесна з іншымі ўстановамі культуры з першых сваіх крокаў павінна стаць ініцыятарам правядзення значных мастацкіх акцый накшталт рэспубліканскага пленэру акварэлістаў, прысвечанага 225-годдзю Яна Баршчэўскага. Далейшая дзейнасць у гэтым кірунку, якая ўключае тэматычныя пленэры, фестывалі па мастацтву, вочных і завочных творчых конкурсаў і іншых значных сацыяльна-культурных мерапрыемстваў, надасць гораду вядомасць і аўтарытэт у шырокім коле культурнага жыцця рэспублікі.

## АСПИРАНТУРА ПО ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫМ ПРОГРАММАМ В ОБЛАСТИ ИСКУССТВОВЕДЕНИЯ В СИСТЕМЕ ВЫСШЕГО ХУДОЖЕСТВЕННОГО ОБРАЗОВАНИЯ: ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ

***Сапанжа Ольга Сергеевна,***
*доктор культурологии, профессор,*
*заместитель декана по научной работе факультета*
*изобразительного искусства, профессор кафедры*
*художественного образования и декоративного искусства*
*Российский государственный педагогический*
*университет имени А.И. Герцена,*
*Санкт-Петербург, Российская Федерация*
*e-mail: sapanzha@mail.ru*

С 2013–2014 учебного года в соответствии с Федеральным законом от 29 декабря 2012 г. № 273-ФЗ «Об образовании в Российской Федерации», аспирантура стала третьим уровнем высшего образования. Новую норму закрепил пункт 3 статьи 12, согласно которому к основным образовательным программам относятся образовательные программы высшего образования – программы бакалавриата, программы специалитета, программы магистратуры, программы подготовки научно-педагогических кадров в аспирантуре (адъюнктуре), программы ординатуры, программы ассистентуры-стажировки.

Включение аспирантуры в систему формального высшего образования с выдачей диплома установленного образца и присвоением квалификации «Исследователь. Преподаватель-исследователь» наложило на учебные заведения и научно-исследовательские институты обязательства по обеспечению образовательной деятельности обучающихся. В частности, седьмая статья закона обязывает организации, осуществляющие образовательную деятельность по имеющим государственную аккредитацию образовательным программам, разрабатывать их, учитывая федеральные государственные образовательные стандарты и примерные основные образовательные программы.

При этом, сегодня достаточно активно идет дискуссия об эффективности аспирантуры как уровня образования в решении задач обеспечения науки и системы образования кадрами высшей квалификации. Среди основных претензий к аспирантуре как третьей ступени высшего образования можно выделить следующие:

– *необязательность прохождения собственно образовательной программы лицами, имеющими солидный опыт профессиональной деятельности в профильной области.* Однако для таких лиц, самостоятельно выполнивших диссертационное исследование без освоения программ подготовки в аспирантуры, есть возможность прикрепиться для сдачи кандидатских экзаменов. Прикрепление предусматривает и возможность выполнения (завершения) диссертационного исследования в организациях, на базе которых существует действующий Диссертационный совет. Подобная формальная

Репозиторий ВГУ